ДУ “Мінская абласная бібліятэка імя А.С. Пушкіна”
Аддзел бібліятэказнаўства



# “Калі песня душу грэе…”

метадычныя парады да 115-годдзя
з дня нараджэння Адама Русака

Мінск 2019

# Змест

Біяграфія ........................................................................ 3

Літаратурна-музычная вечарына.................................... 6

Метадычная скарбонка ................................................ 20

Прыклады для назваў мерапрыемстваў ....................... 22

Дадатак........................................................................ 24

Выданні пісьменніка..................................................... 25

Літаратура аб жыцці і творчасці пісьменніка ............ 26

Электронныя рэсурсы................................................... 30

## Біяграфія

Адам Герасімавіч Русак нарадзіўся 24 мая 1904 года ў в. Пясочнае (зараз Капыльскі раён Мінскай вобласці).

Бацька, Герасім Сямёнавіч, быў скрыпачом-самавукам, іграў полькі і кадрылі. Музычныя здольнасці бабулі-цыганкі і бацькі ўнаследаваў і Адам Русак. Скрыпка з малых дзён была яго марай. На бацькавай скрыпцы ён вучыўся іграць, як і бацька, полькі і кадрылі, а потым яны разам ігралі на вясковых вечарынках і вяселлях. У сям'і выхоўвалася чацвёра дзяцей, але ніхто з астатніх траіх не выявіў музычных здольнасцяў. У 1914 г. Адам Русак скончыў Пясочанскую пачатковую школу. Працаваў на гаспадарцы. У 1922 г. паступіў у Мінскі будаўнічы тэхнікум. Тэхнік з яго не выйшаў. Ён больш хадзіў па тэатрах і рэстаранах, каб паслухаць музыку, чым сядзеў над чарцяжамі. У хуткім часе пакінуў вучобу. У 1925–1930 гг. Вучыўся ў Мінскім музычным тэхнікуме, іграў у сімфанічным аркестры Беларускага радыё і адначасова служыў музыкантам у Чырвонай Арміі. У 1930–1934 вучыўся ў Ленінградскай кансерваторыі па класу скрыпкі і валторны. Адначасова з 1932 года і пасля заканчэння кансерваторыі працаваў салістам аркестра Ленінградскага Малога акадэмічнага тэатра оперы і балета. У 1942–1944 гг. разам з тэатрам эвакуіраваны ў Арэнбург. З 1949 г. – пенсіянер рэспубліканскага значэння.

Адам Русак узнагароджаны ордэнамі Дружбы народаў, Знак пашаны, медалямі і Ганаровымі Граматамі Вярхоўнага Савета Беларусі. У в. Пясочнае і ў Копыле імем А. Русака названа вуліца, там яму ўстаноўлена мемарыяльная дошка. Таксама на радзіме паэта ў в. Пясочнае адкрыты музей.

Першы верш Адама Русака “Мая песня” апублікаваны 27 мая 1927 года ў часопісе “Чырвоны сейбіт”. Больш рэгулярна пачаў друкавацца з 1932 года (у часопісах “Полымя рэвалюцыі”, газетах “Звязда”,”Літаратура і мастацтва”). У 1940 годзе быў падрыхтаваны да друку першы яго зборнік “На родных палетках”, але вайна перашкодзіла яго своечасоваму выданню. Ён убачыў свет толькі ў 1946 годзе. Адам Русак – аўтар зборнікаў паэзіі “Песні і вершы”, “Песні” (на рускай мове), “Пад голас баяна”, “Толькі з табою”, “Звонкія крыніцы”, “Закрасуйся, Нёман”, “Песні на словы А. Русака”, “Засцілайце сталы”, “Песні радасці” і інш. Выдаў кнігі вершаў для дзяцей “У Буслаўцы”, “Добра ведаю ўрок”. У пачатку творчага шляху А. Русак не ставіў за мэту пісаць песні, але кампазітары самі звярталі ўвагу на яго вершы, ствараючы да іх музыку. Паступова ён стаў прафесійным паэтам-песеннікам. Радзіма, жыццё і праца свайго народа, яго гасціннасць і шчырасць услаўляюцца ў вершах паэта. Для іх характэрны светлыя фарбы, мажорнае гучанне і лёгкі смутак, напеўнасць і прастата, гумар і вобразнасць, блізкая да фальклору. Песня на яго словы “Бывайце здаровы” (музыка І. Любана) стала народнай, вядомай далёка за межамі рэспублікі. Першым яе выканаўцам была
Л. Александроўская. Пра лёс гэтай песні на кінастудыі “Беларусьфільм” у 1983 г. быў пастаўлены аднайменны фільм (сцэнарый Л.Гедравічуса і І. Цішчанкі). Шырокую вядомасць і папулярнасць набылі многія іншыя песні (усяго каля 300) на тэксты вершаў А. Русака: “Толькі з табою”і “Не шукай” (муз. І. Любана), “Лясная песня” і “Па-над-лесам, па-над-борам”

(муз. У. Алоўнікава), “Дняпро” і “Не за вочы чорныя” (муз. Ю. Семянкі), “Узнялося сонца яснае” (муз. Дз. Лукаса), “Дзе ты, зорка мая” (муз. І. Лучанка), “Ціхі вечар” (муз. Г. Вагнера), “Сярожка” (муз. К. Паплаўскага), “Як той Зосі давялося” (муз. Г. Цітовіча), “Чырвоная вяргінечка” (муз. Н. Сакалоўскага), “Як правёў мяне Цімох” (муз. М. Ларкова), “Бульба” (муз. народная) і інш. Вершы А. Русака перакладаліся на рускую, украінскую і іншыя мовы.

Памёр Адам Русак 21 сакавіка 1987 года. Пахаваны у в. Пясочнае Капыльскага раёна.



# Літаратурна-музычная вечарына

## *да 115-годдзя з дня нараджэння Адама Русака*



*“Песня. Якое маленькае*
*і якое яно ёмкае, калі словы*
*і музыка зліты ў адно цэлае,*
*кранаюць чалавеку душу і сэрца”*

***Адам Русак***

**Вядучы.**

Вялікае шчасце для паэта, чарадзея слова, калі яго вершы становяцца песнямі і настолькі змаглі палюбіцца слухачам, што робяцца не толькі песеннай класікай, але і па-сапраўднаму народнымі.

У аўтабіяграфіі Адам Русак піша: “На пачатку сваёй творчасці я не збіраўся спецыяльна пісаць песні. Пісаў вершы так, як умеў, як падказвала сэрца. Кампазітары пачалі прыглядвацца да іх і пісаць музыку, і мне песня стала здавацца больш блізкаю, зразумелаю. Я стаў аддаваць ёй больш увагі. Так і залічылі мяне ў паэты-песеннікі”.

**Чытальнік 1.**

Куды ні глянь – лясы шумяць,
цвіце за полем гай,
а поле – вокам не абняць.
І гэта ўсё – мой край.

Пшаніца, жыта на палях,
усюды ураджай,
стагі, як горы, на лугах.
І гэта ўсё – мой край.

Жыве, працуе мой народ
ці ў снежань, ці ў май,
і харашэе з году ў год
мой родны, вольны край.

Куды ні глянь – лясы шумяць,
за полем рэчка, гай.
І ў сэрцы песні не стрымаць
пра мой любімы край.

**Вядучы.**

Зараз прагучаў верш Адама Герасімавіча Русака “Мой край”, дзе найбольш дасканала і ўсебакова ўвасоблена любоў паэта да роднай зямлі. На гэты верш напісана музыка Я. Ціхановіча.

Паэт-песеннік услаўляў родны край, ён любіў родную зямельку ва ўсе поры года, пра што сведчаць нават назвы песень – “Зімовы вечар”, “Вечнавыя плыні”, “Жніўная песня”,

“Закрасуйся, Нёман”, “Мяцеліца”, “Люблю лугі квяцістыя”, “На Прыпяці”, “Прыляцелі гусі”, “Кудравая вішня”, “Край палескі”.
Ён услаўляў яе руплівых працаўнікоў і адважных абаронцаў. Гэта засведчыла і славутая “Лясная песня” (кампазітар У. Алоўнікаў), якую справядліва называюць гімнам беларускіх партызанаў.

*Ледзь чутна гучыць мінусоўка “Лясная песня”*
*і на яе фоне чытаецца верш.*

**Чытальнік 1.**

Ой, бярозы ды сосны –
Партызанскія сёстры,
Ой, шумлівы ты лес малады.
Толькі сэрцам пачую
Тваю песню лясную
Ды ўспомню былыя гады.

**Чытальнік 2.**

Ды ўспомню пажары,
І варожыя хмары,
І завеі халодных снягоў,
І слату, і нягоды,
І начныя паходы,
І агні партызанскіх кастроў.

**Чытальнік 1.**

Край любімы мой, родны,
Ты на свеце свабодны,

За цябе я на бітву хадзіў,
Каб ніколі, ніколі

Ты не быў у няволі,
Каб чырвонымі кветкамі цвіў.

**Чытальнік 2.**

Адышлі тыя годы,
Адгрымелі паходы,
Толькі пушча за полем шуміць.
Ой, бярозы ды сосны –
Партызанскія сёстры,
Вас ніколі ў жыцці не забыць.

**Вядучы.**

Паэзія Адама Русака адрозніваецца напеўнасцю, задушэўнасцю, лірызмам, мяккім народным гумарам, лёгка кладзецца на музыку. Кампазітар-песеннік Эдуард Зарыцкі сказаў аднойчы: "Вельмі цяжка, напрыклад, было з вершамі Уладзіміра Караткевіча. Самі па сабе яны цікавыя, значныя, філасафічныя, але досыць складаныя для музычнага ўспрымання. Вось Адам Русак у гэтым сэнсе – поўная супрацьлегласць. Ледзь дачытаеш апошні радок верша, мелодыю можна запісваць."



*На экране павольна мяняюцца фотаздымкі прыроды.*

**Чытальнік 1.**

Не шукай ты мяне
Каля жытніх палёў,
Не шукай,
Калі к сэрцу майму
Ты дарог не знайшоў,
Не шукай...
Не кажы ты мне слоў,
Што не грэюць цяплом,
Не кажы...
Калі сэрца тваё
Не палае агнём,
Не кажы...
Не спявай пад акном
Ты мне песні сваёй,
Не спявай…
Калі ў сэрцы не я
Буду песняй тваёй
Не спявай...
Не шукай ты мяне
У цішы вечароў,
Не шукай…
Калі к сэрцу майму

Ты дарог не знайшоў
Не шукай..

**Вядучы.**

Дачка паэта Людміла Адамаўна расказвала, што ў савецкія часы членам Саюза пісьменнікаў выдавалі раз на год пуцёўкі на Чорнае мора, але іх сям’я ніколі не карысталася гэтым прывілеем. “Якое Чорнае мора?! На Нёман, на рэчку, у лес!”. Сям’я Русакоў заўсёды прыязджала на сваёй “Волзе” ў Малінаўку. Людзі казалі, што Адам Русак вельмі любіў збіраць грыбы, лавіць рыбу. Любіў пагутарыць з вяскоўцамі і сваякамі.

**Чытальнік 2.**

І зноў я тут, сярод палёў
Малінаўкі маёй,
Сярод суседзяў, землякоў,
Сярод радні маёй.

**Вядучы.**

Усюды ён быў жаданым госцем са сваёй скрыпачкай, са сваімі вясёлымі вершамі-прыпеўкамі і вершамі-тостамі. А пры растанні Русак дарыў зборнік вершаў, які заўсёды быў пад рукой.

Самымі папулярнымі песнямі сталі творы паэта, напісанныя ў 1960-я гг. І ўсе яны пра каханне. У іх аўтар адыходзіць ад знешняга выяўлення галоўнага чалавечага пачуцця. Тэксты вылучаюцца выключным лірызмам і філасафічнасцю. Тая адзіная, якой прысвечаны творы, асаблівая, непадобная да іншых.

**Чытальнік 1.**

Толькі з табою мне хочацца быць,
Толькі з табою,
Радасць і шчасце з табою дзяліць
Толькі з табою.

Ранняй часінай к табе я лячу,
Позняй парою.
Толькі к табе прыхіліцца хачу
Сэрцам, душою.

Выйсці у поле, дзе нівы шумяць,
Там, за ракою.
Першую зорку на небе спаткаць
Толькі з табою.

Гэтак не страшны цяжкія пуці
Будуць з табою,
Гэтак ісці неразлучна ў жыцці
Толькі з табою.

**Вядучы.**

Мы паслухалі верш “Толькі з табою”, на які беларускі савецкі кампазітар Іссак Любан напісаў музыку. І атрымалася цудоўная песня. Зараз мы яе паслухаем у выкананні Зміцера Вайцюшкевіча.

*Гучыць запіс песні “Толькі з табою”*

**Вядучы.**

Адам Русак пісаў і вершы для дзяцей. У сваіх творах ён раскрыў таямніцы душы дзяцей розных узростаў – падлеткаў, малодшых школьнікаў, дашкольнікаў. Зараз мы паслухаем верш пра маму.

**Чытальнік 1.**

Палячу я пчолкай
На лугі, палеткі,
Назбіраю маме
Мёду з кожнай кветкі.

Хай пітва нап’ецца,
Што ў сонцы хмялела,
Каб нічым ніколі
Мама не хварэла.

Выйду ў лес птушыны,
Песень назбіраю,
Пра вясну і радасць
Маме заспяваю.

Супыню над лесам
Хмару-навальніцу,
Хай уночы маме
Светлы сон прысніцца.

Ды дарункаў гэтых,
Пэўна, будзе мала,
Каб табе аддзячыць
За твой клопат, мама.

**Вядучы.**

У сваёй творчасці Адам Русак арыентаваўся на ўзроставыя асаблівасці юных чытачоў, умеў задаволіць іх цікаўнасць, узбагаціць веды, актывізаваць фантазію, станоўча ўплываць на фарміраванне характару. Пісьменнік быў упэўнены, што дзіцячы верш павінен быць толькі добрым, цікавым і карысным.

**Чытальнік 2.**



Я не то што вам хвалюся,
Што вучуся лепш за ўсіх.
У хвасце я не цягнуся
І не горшы за другіх.

Толькі крыўдна мне бывае,
Што настаўніца мяне,
Як другіх, не выклікае
І заўсёды абміне.

Нібы ганьба мне якая
Ці урокаў не вучу, –
Руку першы паднімаю,
Расказаць урок хачу.

А ўчора ўсё збылося,
Што і сам я не чакаў,
Ад таго ўсё пачалося,
Што рукі я не падняў.

І настаўніца адразу
Запрыкмеціла здалёк
І гаворыць:
– Ну, расказвай
Нам, Паўлуша, свой урок.



Стаў я смела, без аглядкі,
Перад класам, як салдат,
Ад пачатку па парадку
Расказаў усё падрад.

Пра даліны, рэкі, горы,
Дзе пачатак, дзе канец.
Скончыў я. Яна гаворыць:
- Што ж... садзіся... маладзец...

Не хвалюся я ніколі
Перад класам назнарок,
А калі іду у школу,
Добра ведаю урок.

**Вядучы.**
Зараз мы паслухалі яшчэ адзін верш Адама Русака для дзяцей “Добра ведаю ўрок ”. І нягледзячы на тое, што сёння на нашай сустрэчы дзяцей амаль няма, спадзяюся, что гэты верш будзе цікавы і дарослым, бо ўсе мы былі дзецьмі!

**Вядучы.**

Кожнае лета Адам Русак прыязджаў у родныя мясціны. Сустракаўся з сябрамі ў Пясочным, а потым кіраваўся ў Малінаўку, дзе бацькі прыдбалі новую хату. У такія хвіліны асабліва радавалася маці паэта Марыля Ігнатаўна. Яна мела цудоўны голас, ведала шмат песень. Часам сядзеўшы на лаве, яны хораша спявалі са старэйшым сынам. Калі ад’язджаў Адам у Ленінград, Марыля Ігнатаўна нязменна прасіла: “Сыночак, хоць напішы колькі слоў па прыездзе”.

Адам Русак на той час пісаў ужо вершы. Неяк не устрымаўся, бацькам адказаў паэтычнымі радкамі:

Бывайце здаровы,
Жывіце багата,
А я ўжо прыехаў
Да дому, дахаты

Так нарадзілася вядомая песня “Бывайце здаровы”. Першым спеваком – выканаўцам стала маці Марыя Ігнатаўна, потым іншыя вяскоўцы, хутка ж песня загучала ў навакольных вёсках. Сёння яе спяваюць ва ўсіх кутках Беларусі і за яе межамі. Яна стала своеасаблівай візітнай карткай беларускага народа, яго песеннага мастацтва.

**Чытальнік 1.**

А зараз мы вам прапануем прыняць удзел у нашым песенным конкурсе. Запрашаем 6 чалавек. Пад мінусоўку трэба будзе спець па куплеце песні “Бывайце

здаровы”. Тыя, хто ні разу не памыляцца, атрымаюць у падарунак зборнік Адама Русака. Пачынаем!

*Гучыць мінусоўка “Бывайце здаровы”*
*і па чарзе спяваюць удзельнікі.*

Бывайце здаровы,
Жывіце багата,
Ужо ж паедзем
Да сваёй хаты.
У зялёнай дуброве
Мы начаваць будзем
І вашае ласкі
Вавек не забудзем.

Першы удзельнік

У вашам калгасе
Шырокае поле,
Няхай жа на шчасьце
Цьвіце ваша доля.
На рэчках на вашых
Бурлілі каб воды,
Каб плавалі з крыкам
Гусей карагоды.

Другі удзельнік

Каб жыта ў полі
Трубою вілося,
Каб сала ў хаце
Клубамі вялося.
Штодзень у капусьце
Каб плавала шкварка,
Да шкваркі часінай
Вялася б і чарка.

Трэці удзельнік

Яшчэ вам жадаем
Прыбытку ў хаце
Ні мала, ні многа -
Штогод па дзіцяці.
Ня будзем у крыўдзе
Яшчэ і на тое,
Калі пашанцуе -
На год і па двое.

Чацвёрты удзельнік

Дарогу ж мы знаем
Да вас, ягамосьці
І езьдзіць мы будзем
Да вас часта ў госьці.
Эй, хто на адведы,
Эй, хто на радзіны –
Вазіць каравaі
Па дзьве паўасьміны.

Пяты удзельнік

Бывайце здаровы,
Жывіце багата,
Ужо ж паедзем
Да сваёй хаты.
У зялёнай дуброве
Мы начаваць будзем
І вашае ласкі
Вавек не забудзем.

Шосты удзельнік

Бывайце здаровы,
Жывіце багата,
Ужо ж паедзем
Да сваёй хаты.

Усе разом

**Вядучы.**

Дзякуй вам за цудоўны спеў! Вы ўсе малайцы! Ні разу не памыліліся! Таму вось вам на памяць аб нашай сённяшняй сустрэчы – паэтычныя зборнікі Адама Русака!

Няхай песня Адама Русака застаецца ў памяці і ў вашых сэрцах. І гэта будзе самая найлепшая ўзнагарода для сапраўднага паэта! Да новых сустрэч!



**Метадычная скарбонка**
**(формы і апісанне мерапрыемстваў,**
**прысвечаных А. Русаку)**

| **Формы** | **Апісанне** |
|---|---|
| выстава-віктарына | Выставу-віктарыну складаюць пытанні і экспазіцыя літаратуры, з дапамогай якой чытачу прапануецца адказаць на пытанні гэтай віктарыны. Пытанні павінны быць рознай катэгорыі складанасці, ўлічваць катэгорыю чытачоў, якім прапануецца выстава. |
| выстава-крыжаванка | Выстава-крыжаванка носіць забаўляльна-пазнавальны характар. Яе аснова – невялікая крыжаванка, адказы на якую ўтрымліваюцца ў прадстаўленай на выставе літаратуры,прысвечанай Адаму Русаку. Прызначаецца ў асноўным для дзяцей, хоць можа прыцягнуць і дарослых. |
| выстава-пошта | Выстава зэлементаміпошты,якія дапамагаюцьусталяваць зваротнуюсувязь нааснове рэкамендаванай літаратуры. Напрыклад, можна прапанаваць напісаць лісты да паэта-песенніка Адама Русака. Лісты стануць экспанатамі выставы разам з кнігамі. |
| выстава-каляндар | Штомесячна на выставе-каляндары змяшчаюцца кнігі, мастацкія альбомы, матэрыялы з перыёдыкі, якія тычацца чарговых памятных і юбілейных дат. Напрыклад, прысвечаныя юбілею творчай дзейнасці Адама Русака. |
| выстава-партрэт | Выстава-партрэт ставіць мэтай прыцягнуць увагу да пэўнай асобы, абудзіць жаданне як мага больш даведацца пра гэтага чалавека, яго жыццё і дзейнасць. Традыцыйна на персанальнай выставе прысутнічаюць тры раздзелы: першы раздзел |

| | |
|---|---|
| | апавядае пра жыццё асобы.Другі раздзел прысвечаны яе дзейнасці.Трэці раздзел прадстаўляе уласна творы, працы гэтага чалавека. |
| выстава-сюрпрыз | Выстава-сюрпрыз заўсёды падразумявае маленькі, недарагі, але прыемны падарунак для наведвальніка, які ён пасля выставы забярэ з сабой. Напрыклад, да выставы «Лётае песня па свеце» падрыхтаваць падборку гуказапісаў на вершы Адама Русака. |
| дыскусійныя арэлі | Абмеркаванне дзвюма камандамі якой-небудзь праблемы, пытання. |
| паэтычны лабірынт | Мерапрыемства, арганізаванае з удзелам аматараў паэзіі, накшталт паэтычнай віктарыны. |
| аўтарскі марафон | Цыкл масавых мерапрыемстваў, аб'яднаных агульнай тэматыкай. Праграму бібліятэчнага мрафона складаюць інтэлектуальныя пытанні і творчыя заданні, разнастайныя конкурсы. Аўтарскі марафон прысвечаны аднаму пісьменніку, напрыклад, Адаму Русаку і яго творчай дзейнасці. |
| флэшбук | Прэзентацыя або знаёмства з цікавымі кнігамі з дапамогай цытат, ілюстрацый, асабістых перажыванняў і іншай інфармацыі пра кнігу. |
| бенефіс пісьменніка | Бібліятэчны вечар, на якім ушаноўваецца пісьменнік. Галоўная ўмова – абавязковы ўдзел героя. У рамках сустрэчы бібліятэкар вядзе дыялог з чытачамі, гучаць фрагменты літаратурных твораў, прэзентуюцца новыя выданні. |

## Прыклады для назваў мерапрыемстваў

“А песня засталася…”

“Адам Русак – пясняр Беларусі”

“Без той песни я жить не могу...”

“Больш за ўсё ён быў роднаму краю аддany”

“Бывайце здаровы”, або Прыгоды вядомай песні”

“Ваш дружбак, Адам Русак”

“Ветераны уходят, а песня жива”

“Гонар і слава Капыльшчыны”

“Дзе ты, зорка мая, непагасная?”

“Душа человек – Адам Русак”

“Жизнь в песне”

“Жывая стыхія творчасці”

“З імем Песняра”

“З мелодый сатканы радок”

“З песняй у жыццё”

“І свет заспяваў “Бывайце здаровы”

“Крыніцы б'юць з глыбінь”

“Лётае песня па свеце”

“Людзі да шчасця імкнуцца, песні ад радасці льюцца…”

“Май сярод зімы”

“Мара верша – быць перапетым”

“Мілей за ўсё мясціны родныя”

“На радзіме Адама Русака”

“Нарадзіўся я ў маі...”

“Падарожжы па роднай зямлі з Адамам Русаком”

“Падданы яе вялікасці песні”

“Па-зямляцку шчыра”

“Песні скрыпача самавука і віртуоза”

“Песня, якая стала народнай”

“Пісьменнік, патрыёт, зямляк”

“Праўда і мужнасць таленту”

“Пялёсткі вершаў у сэрцы маім”

“Святло далёкай зоркі”

“Скарб народа – Адам Русак”

“Скрыпка Адама Русака”

“Сярод суседзяў, землякоў, сярод радні сваёй…”

“Тут яго сэрца...”

“Тую песню я вечна спяваю...”

“У госці да паэта-земляка”

“Ушанаванне народнасцю”

“Чуцен голас яго...”

“Яго словы з песень не выкінеш”

# Дадатак

## БЫВАЙЦЕ ЗДАРОВЫ



## Выданні пісьменніка

Выбранае : песні і вершы / Адам Русак. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1972. – 158, [1] с. – (Бібліятэка беларускай паэзіі)

Закрасуйся, Нёман: песні, лірыка, гумар / Адам Русак. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1978. – 253 с.

Засцілайце сталы :выбранае / Адам Русак; аўт. прадм. Г.Цітовіч. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1984. – 222 с.

Звонкія крыніцы : песні, вершы / Адам Русак. – Мінск : Беларусь, 1965. – 189с.

На Родине :стихи/ Адам Русак. – М. : Сов.писатель, 1985. – 62 с.

На родных палетках: вершы і песні / Адам Русак. – Мінск : Дзяржвыд. БССР, 1946. – 98, [2] с.

Пад голас баяна : песні і вершы / Адам Русак. – Мінск : Дзяржвыд БССР, 1957. – 142 с.

Песні / Адам Русак. – Мінск : Дзяржвыд БССР, 1954. – 96 с.

Пролетели ветры :стихи и песни/ Адам Русак. – М. : Сов.писатель, 1969. – 102 с.

Толькі з табою : выбранае / Адам Русак. – Мінск : Дзяржаўнае выдавецтва БССР, 1960. – 174 с.

У Буслаўцы : вершы : для малодшага ўзросту / Адам Русак. – Мінск : Беларусь, 1967. – 19, [1] с.

## Літаратура аб жыцці і творчасці пісьменніка


24 мая – 100 год з дня нараджэння А. Г. Русака (1904–1987), паэта-песенніка [ураджэнца в. Пясочнае Капыл. р-на] // Новыя кнігі : па старонках беларускага друку. – 2004. – №2. – С. 15–16.

Андруковіч, А. "Калі песня душу грэе…" Лёс і песні Адама Русака / А. Андруковіч // Роднае слова. – 1994. – № 5. – С. 47.

Астрэйка, А. Зайдросная доля : да 70-годдзя з дня нараджэння А. Русака / А. Астрэйка // ЛіМ. – 1974. – № 21. – С.4.

Бароўская, І. А песня засталася… : [творчасць Адама Русака, паэта] / Ірына Бароўская // Роднае слова. – 2004. – № 5. – С. 5–8.

Бароўская, І. А. "Дзе ты, зорка мая, непагасная?": да 110-годдзя з дня нараджэння Адама Русака / Ірына Бароўская // Роднае слова. – 2014. – № 5. – С. 77–80.

Барыс, С. "Бывайце здаровы" : з гісторыі песні на словы А. Русака / С. Барыс // Роднае слова. – 1992. – № 12. – С. 73–75.

Бельскі, А. "Калі песня душу грэе…" / Алесь Бельскі // Краса і смутак : дапаможнік для настаўнікаў. – Мінск, 2000. – С. 61–66.

Бур'ян, Б. "Мара верша – быць перапетым" / Б. Бур'ян // Беларуская думка. – 1999. – № 10. – С. 168–170.

Гнилозуб, В. На Копыльщине вспоминали Адама Русака / В. Гнилозуб // Белоруская нива. – 2004. – 26 мая. – С. 6.

Граховский, С. Ветераны уходят, а песня жива / Сергей Граховский // Вечерний Минск. – 1994. – 24 мая.

Дзвінская, Э. Песня, якая стала народнай / Эла Дзвінская // Наша слова. – 2017. – 26 крас. – С. 2.

Дитлов, А. Душа человек – Адам Русак [белорус.писатель, уроженец Копыльщины] / А. Дитлов // Рэспубліка. – 1999. – 4 чэрв. – С.10.

Клімовіч, А.З мелодый сатканы радок / А. Клімовіч // Мінская праўда. – 2004. – 11 мая. – С. 1, 4.

Клімовіч, А. Ізноў я тут, сярод Малінаўкі маёй / А. Клімовіч // Мінская праўда. – 2004. – 30 крас. – С. 4.

Корсак, Д. Главная застольная песня / Дмитрий Корсак // Минщина : легенды, события, люди / Дмитрий Корсак. – Минск, 2011. – С. 173–176.

Літвін, А. "Людзі да шчасця імкнуцца, песні ад радасці льюцца…" / А. Літвін // Народная газета. – 1999. – 3 верас. – С. 5.

Макарэвіч, В. Ад песень дудароў / В. Макарэвіч // ЛіМ. – 1984. – 25 мая. – С. 12.

Макарэвіч, В. Падданы яе вялікасці песні / Васіль Макарэвіч // Полымя. – 2014. – № 5. – С. 148–153.

Макарэвіч, В. Скрыпка Адама Русака : верш / Васіль Макарэвіч // ЛіМ. – 1992. – 2 кастр. – С. 8.

Маліноўскі, М. І свет заспяваў “Бывайце здаровы” / Міхась Маліноўскі // Культура. – 2006. – № 38. – С.15.

Мушынская, Т. “Тую песню я вечна спяваю...” / Т. Мушынская // Мастацтва. – 2004. – № 7–8. – С. 59–61.

Пірог, У. Песні скрыпача самавука і віртуоза / Уладзімір Пірог // Краязнаўчая газета. – 2014. – № 21 (чэрв). – С. 7.

Разанаў, А. Песенная існасць творчасці Адама Русака / А. Разанаў // ЛіМ. – 1972. – 29 верас. – С. 10.

Роман, А.І. Вывучэнне тэмы “Літаратурная песня” / А.І. Роман // Беларуская мова і літаратура. – 2008. – № 10. – С. 20–26.

Русак, Л. “Ваш дружбак, Адам Русак” / Людміла Русак ; гутарыла Алена Клімовіч // Сельская газета. – 2014. – 24 мая. – С. 26.

Русак, Л. Дружа Ісаак! Піша твой дружа Русак / Людміла Русак ; гутарыла Ірына Свірко // Рэспубліка. – 2014. – 24 мая. – С. 6.

Ткачэнка, Дз. “Бывайце здаровы”, або Прыгоды вядомай песні / Дзіяна Ткачэнка // Слава працы. – 2014. – 24 мая – С. 4.

Ткачэнка, Дз. Да Адама Русака / Дзіяна Ткачэнка // Літаратура і мастацтва. – 2014. – 30 мая – С. 3.

Ткачэнка, Дз. У госці да паэта-земляка / Дзіяна Ткачэнка // Слава працы. – 2014. – 31 мая – С. 5.

Федаровіч, Г.М. Далучэнне дзяцей да свету мастацкай літаратуры / Г.М. Федаровіч // Пачатковая школа. – 2009. – № 2. – С. 50–61.

Хорсун, С. Дарогамі памяці / Святлана Хорсун // Мінская праўда. – 2014. – 13 снеж. – С. 3.

Цітовіч, Г. З песняй у жыццё / Г. Цітовіч // Полымя. – 1974. – № 5. – С. 228–230.

Шэіна, М.“Нарадзіўся я ў маі...” / Марыя Шэіна // Слава працы. – 2009. – 30 мая. – С. 1, 12.

Шэіна, М. Ён быў багаты дружбаю сяброў : да 90-годдзя з дня нараджэння А. Русака / Марыя Шэіна // Слава працы. – 1994. – 21 мая. – С. 3–4.

Шэіна, М. Тваe брэнды, Капыльшчына / Марыя Шэіна, Дзіяна Ткачэнка // Слава працы. – 2018. – 25 жн. – С. 8, 13

## Электронныя рэсурсы


"Ваш дружбак, Адам Русак" [Электронны рэсурс] / Алена Клімовіч // СБ. Беларусь сегодня. – Рэжым доступа: https://www.sb.by/articles/vash-druzhbak-adam-rusak.html. – Дата доступа: 27.02.19.

Песню "Бывайце здаровы" белорусского поэта Адама Русака присвоил себе поэт-песенник Михаил Исаковский, автор "Катюши" [Электронный ресурс] // СТВ. – Режим доступа: http://www.ctv.by/новости/АдамРусак. – Дата доступа: 27.02.19.

По дорогам Копыльщины колесит автобус с портретом Адама Русака [Электронны рэсурс] / Марыя Шэіна // Слава працы. – Рэжым доступа: http://www.kopyl.by/?p=69435. – Дата доступа: 27.02.19.

**“Калі песня душу грэе”**
(метадычныя парады да 115-годдзя
з дня нараджэння Адама Русака)

Складальнікі: Мельнічак А.А.

Адказны за выпуск: Лыка М.У.

Падпісана да друку: 17.04.2019 г.

Тыраж 3 экз. Заказ № 5

---

220005 г. Мінск, вул. Гікалы, 4
ДУ “Мінская абласная бібліятэка імя А.С.Пушкіна”